*Наталля Анапрэенка*

# МІФАЛАГІЧНЫ КАМПАНЕНТ У ТВОРЧАСЦІ Б. ЛЕСЬМЯНА

Роля міфа ў структуры чалавечага існавання выключная. Адзін з буйнейшых сусветных культуролагаў М. Эліадэ падкрэсліваў, што міф – гэта «прэцэдэнт, мадэль для ўсіх відаў і форм быцця» [5, *334*]. У сучаснай навуцы з паняццем «міф» звязана вобразна-сімвалічнае адлюстраванне свету, а даследаванні ў галіне псіхалогіі дазваляюць меркаваць аб наяўнасці ў глыбінях чалавечай псіхікі міфалагічных структур. Кожная творчая індывідуальнасць мае магчымасць стварыць уласную ўнікальную міфалогію: на аснове неўсвядомлена задзейнічанага архетыпа пісьменнік мадэлюе новую рэальнасць, інтэрпрэтуе навакольную рэчаіснасць, надаючы ёй асабісты ўзор светастварэння. Бясспрэчна, міфалагічная форма адлюстравання рэчаіснасці найбольш поўна раскрываецца ў творах літаратуры і мастацтва. Яшчэ вядомы нямецкі філосаф Ф. Шэлінг адзначаў, што міфалогія «ёсць свет і, так бы мовіць, глеба, на якой толькі і могуць расквітаць і расці творы мастацтва. Толькі ў межах такога свету магчымы ўстойлівыя і вызначаныя вобразы, праз якія толькі і могуць атрымаць выяўленне вечныя паняцці» [4, *105*].

Адметнай рысай літаратурнага працэсу канца XIX − пачатку XX стст. стала адраджэнне агульнакультурнага інтарэсу да міфалогіі і фальклору. Міфатворчасць выступала і як прыём (неаміфалагічныя павевы, што ішлі ад рамантычнай традыцыі, былі абумоўлены ўплывам мадэрнізму), і як светаадчуванне (непрыняцце творчай асобай буржуазнага свету як антыэстэтычнага, усведамленне крызісу буржуазнай культуры як крызісу цывілізацыі ў цэлым). Выкарыстанне міфалагічных і фальклорных матываў адыгрывала важную ролю ў мастацкім даследаванні гістарычнага жыцця і вызначэнні месца чалавека ў ім, спрыяла ўвасабленню найбольш агульных заканамернасцей і канфліктаў грамадскага развіцця, дазваляла «стварыць крайне абагульненую сімвалічную карціну рэальна існуючага свету» [2, *14*], што было абумоўлена напружаным рытмам самой эпохі. Аднак галоўная функцыя міфа заключаецца ў тым, што ён з'яўляецца сродкам выяўлення «вечных» псіхалагічных пачаткаў, раскрываючы ўнутраную сутнасць чалавека і яго сувязі з універсумам. Па словах Ф. Ніцшэ, «міф можа наглядна ўспрымацца як адзіночны прыклад некаторай усеагульнасці і ісціны, што няўхільна звяртае погляд свой у бясконцае» [3, *530*]. Сканцэнтраванасць міфалагічнай думкі на метафізічных праблемах дазваляе весці размову пра выхад за сацыяльна-гістарычныя і прасторава-часавыя рамкі.

У творчасці польскага паэта Баляслава Лесьмяна (1878−1937) значнае месца належыць фальклорным і міфалагічным традыцыям. Фактарамі, якія абумовілі зварот пісьменніка да іх, былі эстэтыка сімвалізму і распрацаваны Лесьмянам «міф першабытнага чалавека», для якога характэрны перш за ўсё метафізічны спосаб мыслення. Арыгінальнасць польскага мастака слова заключалася ў спробе спалучыць матывы першабытнасці з матывамі вяртання да прыроды, натуральнасці і непасрэднасці. «Міф вяртання да

прыроды» або «міф паэта як чалавека першабытнага» найбольш яскрава праявіўся ў яго творах, заснаваных менавіта на міфалагічных і фальклорных традыцыях. Непрыманне рэчаіснасці, антыфілістарскі бунт, пачуццё трагізму, беспрасветнасці існавання, трывога за ўсё жывое абумоўліваюць устойлівы зварот паэта да вобразаў нацыянальнай і пазанацыянальнай міфалогіі. Лесьмян глыбока вывучаў нацыянальны і сусветны фальклор, і гэтая зацікаўленасць мела значны ўплыў на яго арыгінальную творчасць. «Не выклікае сумненняў і тое, што на аснове прарамантычнай, дакладней, неарамантычнай-сімвалісцкай сістэмы поглядаў, у паэзіі Лесьмяна цалкам невымушана, дзякуючы той жа анталагічнай першаснасці лірычных аб’ектаў, аб’ядноўваюцца міфа-фальклорны і натурфіласофскі праблемна-тэматычныя пласты. Прычым час і прырода (свет) успрымаюцца ім у катэгорыях уласнага бесперапыннага развіцця, дынамікі, а прыроднае і чалавечае з’яўляюцца ў дыялектычнай непарыўнасці», як слушна адзначаў украінскі даследчык В. М. Васіленка [1, *116*].

Чэрпаючы сюжэты і вобразы з народных вераванняў, паданняў, легенд, Лесьмян перапрацоўвае іх унутраны, ідэйны змест для вырашэння ўласных мастацкіх задач. Аўтарскае мысленне накладваецца на мысленне міфапаэтычнае – так, па сутнасці, ствараецца новая рэальнасць, калі сюжэт або асобны вобраз набываюць зусім іншыя рысы і афарбоўку.

Міфалагічны кампанент у творчасці Лесьмяна выяўляе сябе перш за ўсё праз стварэнне аўтарам сістэмы вобразаў, як выдуманых ім самім (Знікомак, Новалунніцы, Снітрупак, Снігробак, Срэбронь і інш.), так і запазычаных з народных павер’яў (Васіліса Прамудрая, Палудніца, Тапелец, русалка і інш.). Міфалагічны матэрыял, які стаў асновай вобразаў, вёў да шырокіх філасофскіх абагульненняў, дазваляў выйсці за прасторавыя і часавыя межы ў «вечнае».

Рэмінісцэнцыі з індыйскай міфалогіі арганізуюць сюжэтную тканіну балады Лесьмяна «Пururава і Урвашы» («Pururawa i Urwasi»), у якой спалучаны легенда аб здабыванні агню і аповед пра лёс зямнога цара Пururавы і нябеснай німфы (апсары) Урвашы. Іх узаемнае каханне разгневала жыхароў неба (ганхарваў), і яны прыдумалі каварны план, як разлучыць закаханых. Але яны не ўлічылі, што для сапраўднага кахання не існуе перашкод. Пururава прайшоў выпрабаванні, якія ўсклалі на яго вышэйшыя сілы. Ён запаліў нябесны агонь на зямлі, у выніку ажаніўся з Урвашы і стаў адным з нябесных духаў.

Індуісцкая філасофія разглядае гэты свет як часавы прыстанак, месца выпрабаванняў для душы. Існуе мноства галактык і светаў, падобных на наш, і ўсе яны падпарадкоўваюцца закону кармы. Сусвет праходзіць праз бясконцы шэраг цыклаў развіцця, руйнуецца і ствараецца зноў. Гэты свет – з яго асалодамі і пакутамі, дабром і злом – неістотны, зманлівы. Зямное жыццё – ілюзія, часовы прытулак. Яму супрацьпастаўляецца сапраўднае існаванне бязмежных і усемагутных нябесных сіл.

Устойлівая цікавасць да першаасновы быцця з’яўляецца адной з характэрных асаблівасцей паэтычнага свету Лесьмяна, што непасрэдна

звязана з філасофскім складам яго паэтычнага мыслення. У баладзе «Пururава і Урвашы» закранаюцца пытанні пра сутнасць жыцця і пазасветнае існаванне, якія заўсёды былі прадметам рэфлексіі і асаблівай увагі мастака. Аўтар узнімае праблему суадносін чалавека як істоты эфемернай з прыродай сусвету як вечнай катэгорыяй.

Міфапаэтычныя вобразы галоўных герояў, Пururавы і Урвашы, у творы Лесьмяна набываюць адметныя філасофскія і мастацкія значэнні. Міф выступае ў ролі зыходнага матэрыялу ў працэсе ператварэння архаічнага сюжэту на мову сучаснай паэзіі, на складаны сімвалісцкі неаміф. Аўтар напаўняе твор разнастайнымі паэтычнымі сімваламі, якія задаюць чытачу імпульс для разнастайных асацыяцый і высноў. Так, вобраз нябеснай жыхаркі Урвашы сімвалізуе таямніцу быцця, штосьці нязведанае, якое для кожнага чалавека з'яўляецца своеасаблівай мэтай дасягнення. Таму і зачараваны ёй Пururава «*namdlał w taki bezświat, że go już nie było*» [6, 66] («*увамлеў у такое небыццё, што яго ўжо і не было*») [тут і далей пераклад аўтара артыкула. – Н. А.].

Каханне Пururавы да Урвашы з'яўляецца знакам пераадолення мяжы паміж зямным і нетутэйшым светам:

*I tak uczył się nie być od nocy do świtu,*
*Aż się zbudził przy gwiazdach – bywalec niebytu* [6, 66]
*(І так вучыўся не быць ад ночы да світання,*
*Што прачнуўся пры зорках – прабывальнік нябыту).*

Пераход абодвух герояў у тагасвет («*да дзіўнага ручаёвага лесу*») сцвярджае думку, што канчатковай смерці няма, ёсць толькі пераўвасабленне з адной формы ў іншую: чалавек развітваецца толькі з целам, а не з душой, якая працягвае жыць у новых умовах існавання.

У аснову балады пакладзена цыклічная канцэпцыя свету, згодна якой у любой з'яве цяперашняга часу прасвечваюцца яго мінулыя і будучыя рэінкарнацыі. Метамарфозы, што адбываюцца з галоўнымі героямі (уваход у небыццё, поўнае растварэнне ў прыродзе), фіксуюць няўлоўную грань моманту пераўтварэнняў аднаго ў іншае. Гэта яшчэ раз пацвярджае арыентацыю паэта на міфа-фальклорную традыцыю, якая так шчодра выкарыстоўвае матывы загадкавых і неспадзяваных ператварэнняў і пераўвасабленняў.

Спасцігаючы паэтыку і філасофскую сімволіку ведычнага міфа, Лесьмян выпрацоўвае цэлы шэраг прыёмаў, якія валодаюць вялікім мастацкім эфектам.

Балада «Пururава і Урвашы» з'яўляецца яскравым прыкладам прачытання мовай сімвалісцкіх і неарамантычных уяўленняў старажытнага міфа, які ў паэта існуе не ў традыцыйным выглядзе, а пераходзіць на якасна іншы, больш складаны ўзровень мастацкага абстрагавання. Аўтар падтрымлівае ідэю агульнай гармоніі быцця: з духу, які выяўляе сваю прысутнасць ва ўсім, пачынаецца свет. Містэрыя духу заўсёды сакральная і асобасная. Твор Лесьмяна – лірыка-філасофскае спазнанне складанага пытання пра існасць чалавека ў сусвеце. Тут, на зямлі, чалавек з'яўляецца на

імгненне, каб зноў растварыцца ў вялікім, бязмежным і безупынным існаванні. І смерць, і жыццё замыкаюцца на ўніверсум светабудовы:

*A weseli się we mnie życie spoza życia* [6, 67].
*(А цешыцца ўва мне жыццё па-за жыццём).*

Пераняўшы сімвалісцкі сугестыўны стыль, паэт стварае складаную да загадкавасці карціну свету не шляхам разгалінаванага шматступеннага апісання, а апасродкавана – намёкамі, метафарамі, сімваламі:

*Poszli w skwar macierzanki, rozpełzłej samotnie,*
*I zabrnęli w chłód dzwońców – i już bazpowrotnie.*
*Troje było ich w lesie: dwa i jedno ciało,*
*Nikt nie wie, co się z nimi stało lub nie stało* [6, 67].
*(Увайшлі ў гарачыню чабора, што распаўсюдзілась самотна,*
*І зайшлі ў холад званочкаў – і ўжо беззваротна.*
*Трое было іх у лесе: два і адно цела,*
*Ніхто не ведае, што з імі адбылося ці не адбылося).*

Адсюль – пошук незвычайных ракурсаў, калі карціна свету набывае дзіўныя абрысы: падвойваецца, расшчапляецца, часам узнікае некалькі малюнкаў, яны ўзаеманакладаюцца, але поўнасцю не супадаюць.

Такім чынам, міфа-фальклорная традыцыя адыгрывае вызначальную ролю ў распрацоўцы мастацкай канцэпцыі Б. Лесьмяна. На прыкладзе балады «Пururава і Урвашы» можна зрабіць выснову, што міфалагічныя вобразы ў творах польскага паэта нясуць на сабе значную ідэйную нагрузку, адлюстроўваючы шматлікія экзістэнцыяльныя сітуацыі, якія аб'ектыўна існуюць у духоўным свеце чалавека, а таксама функцыянальную, перадаючы філасофскія погляды аўтара на быццё і нябыт, жыццё і смерць, існаванне і забыццё, на праблемы сэнсу і бессэнсоўнасці, нікчэмнасці і велічнасці. Падобныя лесьмянаўскія вобразы цікавыя тым, што сваё ўнутранае напаўненне, той сэнс, які закладзены ў іх аўтарам, яны выражаюць не непасрэдна, а праз шматлікія сувязі і аналогіі з прыродай. Чалавек і духоўны свет знаходзяцца ў адной плоскасці: прырода не падпарадкоўвае сабе чалавека, і чалавек не ўзвышаецца над прыродай – яны раўнапраўныя партнёры, а дакладней, чалавек, як неад'емная частка прыроды, існуе ў ёй самой і не ўяўляецца па-за яе межамі. Можна казаць пра сінтэз эмпірычнай і духоўнай рэальнасцей у творчасці Лесьмяна, бо вечнае не супрацьстаіць тут часаваму, а адметна канцэнтруецца ў ім.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Василенко, В. М.* Поетичний світ Болеслава Лесьмяна / В. М. Василенко / АН УРСР. Ін-т літ. ім. Т.Г. Шевченка. – К., 1990.

2. Мифологизм в западноевропейской литературе XX века: Методические рекомендации по курсу современной западноевропейской литературы / сост. Е. И. Бубенцова. – Могилев, 2002.

3. *Ницше, Ф.* Рождение трагедии, или Эллинство и пессимизм / Ф. Ницше // Ницше Ф. Так говорил Заратустра. К генеалогии морали. Рождение трагедии. Воля к власти. Посмертные афоризмы. – Минск, 2005.

4. *Шеллинг, Ф. В.* Философия искусства / пер. П. С. Попова / Ф. В. Шеллинг. – СПб., 1996.

5. *Элиаде, М.* Трактат по истории религий: в 2-х т. Т. 2. / М. Элиаде. – СПб., 2000.

6. *Leśmian, B.* Zwiedzam wszechświat: Wybor wierszy / Wybór, wstęp i opacowanie W. Boleski / B. Z. Leśmian. – Warszawa, 2006.